МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК
Кафедра сацыяльнай камунікацыі

ЭЙДЗІНА Юлія Эдуардаўна

# ЗНАЧЭННЕ РЭПУТАЦЫІ Ў КАНЦЭПЦЫІ КАРПАРАТЫЎНАЙ САЦЫЯЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БАНКАЎСКАЙ СФЕРЫ (НА ПРЫКЛАДЗЕ БТА-БАНКА)

Дыпломная работа
АНАТАЦЫЯ
Спецыяльнасць 1-23 01 15 Сацыяльныя камунікацыі

Навуковы кіраўнік:
кандыдат гістарычных навук,
прафесар
І.І.Калачова

Мінск, 2024

# АНАТАЦЫЯ

Структура дыпломнай працы складаецца з увядзення, трох раздзелаў і заключэння. Першае два раздзела змяшчаюць тэорыю: у першым раскрываюцца тэарэтычныя асновы карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці (КСА) прадпрыемстваў, закранаецца гісторыя зараджэння і развіцця КСА, асноўныя тэарэтычныя падыходы і тэрміналогія; у другім раскрываецца роля рэпутацыі ў канцэпцыі карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці, прыводзіцца класіфікацыя мадэляў КСА, а таксама спецыфіка КСА ў прадпрыемствах банкаўскай сферы. Трэці раздзел з'яўляецца практычным, ён змяшчае характарыстыку банка «БТА Банк» у аспекце фарміравання КСА, аналіз ўзаемасувязі КСА і рэпутацыі банка ў яго кліентаў, а таксама рэкамендацыі па аптымізацыі мадэлі КСА банка «БТА-Банк». Аб'ём дыпломнай працы складае 56 старонак, уключае 2 дадаткі і 58 выкарыстаных крыніц.

Ключавыя словы: карпаратыўная сацыяльная адказнасць, карпаратыўная сацыяльная дзейнасць, дзелавая рэпутацыя, стэйкхолдар, прадпрыемства банкаўскай сферы, банк, нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя, кампанія, карпаратыўная культура.

Аб'ект даследавання дыпломнай працы – карпаратыўная сацыяльная адказнасць прадпрыемстваў банкаўскай сферы.

Прадмет даследавання дыпломнай працы – рэпутацыя прадпрыемстваў банкаўскай сферы (БТА Банк).

Мэта дыпломнай прац – вывучыць уплыў карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці на фарміраванне рэпутацыі прадпрыемстваў банкаўскай сферы.

Метадалагічную аснову дыпломнай працы склалі агульнанавуковыя метады: метад аналізу і сінтэзу, метад індукцыі і дэдукцыі, метад параўнання, апісальны метад, а таксама прыватнанавуковыя, якія выкарыстоўваюцца прыправядзенні сацыялагічных даследаванняў (апытальны метад).

У працэсе напісання дыпломнай працы былі атрыманы наступныя вынікі: выдзелены розныя падыходы да вызначэння карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці; вызначаны складнікі карпаратыўнай сацыяльнай дзейнасці і іх роля ў развіцці прадпрыемства; раскрыта значнасць карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці банкаўскага прадпрыемства праз яго ўспрыманне кліентамі на прыкладзе банка «БТА-Банк» і дадзены шэраг рэкамендацый па аптымізацыі мадэлі КСА для прасоўвання дадзенага прадпрыемства.

Навізна атрыманых вынікаў абумоўлена адсутнасцю комплекснага падыходу да вывучэння ўзаемасувязі карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці і дзелавой рэпутацыі прадпрыемства, якая фарміруецца ў вачах стэйкхолдараў. Атрыманыя вынікі характарызуюцца шырокімі магчымасцямі тэарэтычнага і практычнага прымянення.

Матэрыялы і вынікі дыпломнай працы былі атрыманы на падставе дакладных крыніц і самастойна праведзеных тэарэтычных і практычных даследаванняў.

Матэрыялы дыпломнай працы могуць прымяняцца ў навучальным працэсе, а таксама пры распрацоўцы і рэалізацыі PR-мерапрыемстваў банкам «БТА-Банк».